устойчиво: ребенок, который ежедневно слышит, как его родители «ласкают» друг друга забористым словом, почти наверняка вырастет «матерноговорящим» и передаст эту привычку своим детям.

Широко распространено так называемое аффективное сквернословие. Оно связано с выражением какого-либо чувства и обычно является эмоциональной реакцией человека на ситуацию, слова или поведение других людей, даже на собственные.

Еще одно из проявлений сквернословия – намеренный эпатаж, вызов обществу, стремление разрушить общепринятые правила приличия. Диапазон этой разновидности мата весьма широк – от элементарного лингвистического хулиганства, надписей на заборах и в туалетах до манерно-циничных (на публике) выступлений некоторых представителей интеллигенции и, так сказать, произведений искусства – книг, кинофильмов, спектаклей.

Язык больше, чем одежда, говорит о вкусе человека, о его отношении к окружающему миру, к самому себе.

Наш язык – это важнейшая часть нашего общего поведения в жизни. Учиться хорошей, спокойной, грамотной речи надо долго и внимательно – прислушиваясь, запоминая, замечая, читая и изучая. Хотя это и трудно, но делать нужно. Наша речь – важная часть не только поведения, но и нашей личности, души, ума.

Друзья! Уважайте друг друга. Живите в ладу. И говорите друг с другом на бессмертном русском языке.

**УДК 821.161.3**

# КНІГА ЯК ФЕНОМЕН БЕЛАРУСКАЙ КУЛЬТУРЫ (З ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСКАЙ КНІГІ)

*Студэнт – Бандарэнка М.В., 49тс, 1 курс, ФТС*
*Навуковы кіраўнік – Смалянка Г.А., ст. выкладчык*
*УА «Беларускі дзяржаўны аграрны тэхнічны ўніверсітэт»,*
*г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*

**Анатацыя.** У артыкуле разглядаецца гісторыя беларускай кнігі, традыцыі славянскай рукапіснай кнігі.

**Ключавыя словы:** кніга папірус, старабеларуская мова, кірыліца, глаголіца.

Кніга – адно са старажытных вынаходніцтваў цывілізацыі. З'яўленне пісьменства і кнігі значна павялічылі магчымасці захавання і перадачы інфармацыі.

Спачатку кнігі былі рукапіснымі. Іх паходжанне вядзецца ад надпісаў, якія нашы продкі рабілі на каменнях, дрэве, папірусе, гліне, бронзе, бяросце. Так, старажытнейшыя з егіпецкіх папірусаў адносяцца да XXV ст. да н.э.

Вядомы дзве асноўныя формы кнігі: кніга – світак і кодэкс – некалькі пласцін ці лістоў, якія злучаны ў блок. Кнігі ў тым выглядзе, у якім мы іх ведаем сёння, з'явіліся толькі ў Сярэднявеччы.

Рукапісныя кнігі на беларускіх землях з'явіліся з распаўсюджваннем хрысціянства.

Цэнтрамі масавай вытворчасці рукапісных кніг на землях гістарычнай Беларусі былі скрыпторыі мітрапаліта ў Вільні, Навагрудку, майстэрні віцебскага Маркава манастыра, супрасльскага Благавешчанскага, пінскага Ляшчанскага, жыровіцкага Успенскага манастыроў, скрыпторый Солтанаў у маёнтку Шышкіні каля Вільні, руская канцылярыя Вялікага Княства Літоўскага. Стагоддзямі займаліся перапісваннем кніг пры многіх полацкіх, смаленскіх і віленскіх цэрквах.

Галоўным матэрыялам, які выкарыстоўваўся для стварэння кніг на беларускіх землях да сярэдзіны XVI ст. быў пергамент. Перапісчыкі карысталіся часцей за ўсё гусінымі ці надрэзанымі трасніковымі палачкамі для пісьма. У якасці чарніл выкарыстоўвалі адвары раслін цёмна – карычневага і чорнага колеру. Мініяцюры стваралі тэмпернымі фарбамі. Завяршала аздабленне кнігі вокладка, якая ўяўляла сабой дзве абцягнутыя скурай дошчачкі. Дадаткова выкарыстоўваліся цісненне па скуры, разнастайныя металічныя накладкі, эмалевыя ўстаўкі.

Для напісання старажытных славянскіх рукапісных кніг выкарыстоўваліся дзве славянскія азбукі – кірыліца і глаголіца. Аднак паступова галоўныя пазіцыі заняла кірылічная рукапісная кніга.

Перапісванне кніг было сапраўдным каліграфічным мастацтвам. Кнігі маглі стварацца пад заказ. Іх, як вялікую каштоўнасць, перадавалі з аднаго манастыра ў другі, ахвяравалі, завяшчалі. Таму зараз складана ўстанавіць месца стварэння той ці іншай рукапіснай кнігі. На аснове параўнання некаторых асаблівасцей тэхнікі стварэння і ўпрыгожвання да кніг, якія з'явіліся на беларускіх землях, можна аднесці Тураўскае Евангелле (XI ст.), Полацкае (XII–XIV ст.), Аршанскае (XIII ст.), Лаўрышэўскае, Мсціжскае Евангелле, Анежскі (Мсціслаўскі) Псалтыр (усе адносяцца да XIII–XIV ст.).

Па меркаванні некаторых даследчыкаў Полацкае Евангелле – унікальны рукапісны помнік XII ст. перапісала сама Ефрасіння Полацкая. Па іншых звестках, яно належала Троіцкаму манастыру і выкарыстоўвалася

як напрэстольнае. Напісана яно на пергаменце, аздоблена мноствам ініцыялаў старажытнавізантыйскага тыпу. Кніга была вывезена падчас вайны з Іванам Грозным і па невядомых прычынах падзелена на дзве часткі. Зараз адна з іх знаходзіцца ў Маскве, другая – у Санкт-Пецярбургу. Рукапіснае Аршанскае Евангелле XII–XIII ст. было знойдзена ў 1812 г. сярод утвары, якую раскідалі французы. Ёсць меркаванне, што яно было створана ў Полацку. Напісана яно на пергаменце, захавалася 142 старонкі без пачатка і канца.

Мінула шмат стагоддзяў, пакуль на Беларусі з'явілася першая друкаваная кніга. Пачынальнікам кнігадрукавання сярод усходніх славян стаў Францыск Скарына. Стаўшы выдатным вучоным, Скарына вырашыў узяцца за друкаванне кніг на старабеларускай мове. У 1517 годзе выйшла ў свет першая друкаваная кніга "Псалтыр", выдадзеная Скарынам. Пры афармленні кніг Скарына шырока выкарыстоўваў ілюстрацыі. Асобныя літары алфавіта, з якіх пачынаўся тэкст, ён упрыгожваў пэўнымі малюнкамі, каб лягчэй запаміналася. Скарына зрабіў першы друкаваны, ілюстраваны, навучальна-асветніцкі пераклад асноўнай часткі Бібліі на мову, набліжаную да старабеларускай.

Прадаўжальнікам справы Скарыны стаў вядомы беларускі друкар і вучоны Сымон Будны. Як і Скарына, ён быў вельмі адукаваным чалавекам, валодаў многімі мовамі. У 1562 годзе Сымон Будны выдаў першую кнігу на беларускай мове аб хрысціянскай веры –"Катэхізіс". Яна была надрукавана ў Нясвіжы.

Важнае месца ў гісторыі кнігадрукавання і культурнага развіцця Беларусі займае дзейнасць друкарні ў Заблудаве. Заблудаўская друкарня былы заснавана ў канцы 60-х гадоў XVI ст. на Гродзеншчыне, у маёнтку беларускага магната Рыгора Хадкевіча і на яго сродкі. Актыўны ўдзел у яе арганізацыі прынялі Іван Фёдараў і Пётр Мсціславец. У 1568 г. у Заблудаўскай друкарні пачала друкавацца першая кніга – "Евангелле вучыцельнае", якая ўбачыла свет 17 сакавіка 1569. Кніга надрукавана фарматам у аркуш, у дзве фарбы. Другое і апошняе выданне заблудаўскай друкарні – "Псалтыр з Часаслоўцам" – выйшла ў свет 23 сакавіка 1570 г.

Важным напрамкам у беларускім кірылічным кнігадрукаванні з'явілася дзейнасць брацкіх друкарняў, якія адыгралі вялікую ролю ў развіцці розных сфер беларускай культуры, мовы, пісьменнасці.

У пачатку XVII ст. у Магілёве пры царкве ў імя ўваходу ў Іерусалім ўзнікла царкоўнае брацтва, якое заснавала сваю друкарню. У 1636 г. у Магілёў перасяліўся С. Собаль, дзе пачаў працаваць у брацкай друкарні. За тры гады С. Собаль надрукаваў "Буквар славенскай мовы" (1636), "Псалтыр" (1637), "Тэстамент цара Васіля да сына Льва" (1638), перавыданні "Апостала" (1637) і "Актоіха" (1638).

У XVII ст. у мястэчку Любча (Навагрудскі павет) існавала буйнейшая рэфармацыйныя друкарня на Беларусі, у дзейнасці якой атрымалі далейшае развіццё асветніцкія, мастацкія і паліграфічныя традыцыі Ф. Скарыны. Друкарскія матэрыялы былі прывезены з Вільні.

У любчанскай друкарні выдаваліся зборнікі вершаў, творы паэтычных аўтараў, працы гісторыкаў, філосафаў. У Любчы быў надрукаваны шэраг навуковых дапаможнікаў. Кнігі любчанскай друкарні афармляліся сціпла, выкарыстоўваліся ксілаграфіі, наборны арнамент. Упершыню ў беларускім кнігадрукаванні для ілюстрацый шырока ўжываліся гравюры на медзі.

Такім чынам, гісторыя беларускай кнігі – старажытная і вельмі насычаная. Яе з'яўленне абумоўлена распаўсюджаннем хрысціянства і звязана ў першыя стагоддзі свайго існавання менавіта з перапісваннем ці друкам Біблii і іншай хрысціянскай літаратуры. Наяўнасць шэрагу скрыпторыяў, майстэрнь, тыпаграфій па вытворчасці кнігі сведчыць аб вялікай ролі, якую адыгрывала кніга ў жыцці нашых продкаў. Кнігу заслужана можна лічыць адным з атрыбутаў беларускай культуры.

**УДК 821.161.3**

## КУЗЬМА ЧОРНЫ І НАЦЫЯНАЛЬНЫ СВЕТАПОГЛЯД

*Студэнт – Кучыц К.В., 49 тс, 1 курс, ФТС*
*Навуковы кіраўнік – Смалянка Г.А., ст. выкладчык*
*УА «Беларускі дзяржаўны аграрны тэхнічны ўніверсітэт»,*
*г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*

**Анатацыя.** Артыкул прысвечаны пытанням нацыянальнага светапогляду ў творах К. Чорнага.

**Ключавыя словы:** пісьменства, нацыянальны светапогляд, родная зямля, малая радзіма.

Творы пісьменнікаў-класікаў заўжды актуальныя для культуры, кожнае наступнае пакаленне звяртаецца да іх у пошуках адказаў на запатрабаванні часу.

Знакавая постаць беларускага прыгожага пісьменства – Кузьма Чорны. Яго творчасць мела надзвычайны уплыў на развіццё нацыянальнай мастацкай свядомасці. За К. Чорным даўно і трывала замацаваліся вызначэнні: пісьменнік-філосаф, пісьменнік-псіхолаг, пісьменнік-наватар.